аўтар атрымаў медаль Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Да 60-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў”. У сюжэтную канву апошняга з названых твораў пакладзены рэальныя факты 1944 года, раскрываецца ход гістарычных падзей у перыяд вызвалення тэрыторыі моста Блахіна. Вядомыя і такія п’есы аўтара, як “Катэдж для генерала”, “Вышэйшая мера”, “Агароджа на вакне”, “Партыйцы завода”. Спынімся падрабязней на апошніх двух драматургічных творах, якія змешчаны ў кнізе “Цені бледнага месяца”. Аўтара тут цікавяць узаемаадносіны паміж мужчынам і жанчынай, вернасць і здрада, маральная ўстойлівасць грамадства. Напрыклад, у час перабудовы пры разборы канкрэтных сем’яў − Бацалавых і Ярскіх − на пасяджэнні парткама выплываюць на паверхню амаральныя паводзіны кіраўніцтва. Гэты сход патрэбны для таго, каб выкрыць хібы насельніцтва: выкарыстанне службовых пасад у сваіх мэтах, падхалімства, разбэшчанасць, п’янства, непрыстойныя міжасобасныя паводзіны. У выніку, Генадзь Катляроў здолеў стварыць яркую камічную сітуацыю ў творы “Партыйцы завода”.

П’еса “Агароджа на вакне” мае сучасны сюжэт, характэрны для рэальнага жыцця. Відавочны любоўны трохкутнік, парушаны звычайны сямейны лад. Напаўзвар’яцелая жанчына-інвалід выступае ў творы носьбітам сумленнасці, дзіцячай наіўнасці, чысціні, добразычлівасці. Акцэнтавана ў п’есе праблема людской адзіноты, недахопу дзіцячай увагі да бацькоў.

Такім чынам, рускамоўная драматургія Віцебшчыны вельмі плённа развіваецца, узбагачаецца новымі імёнамі. Аўтары ўзнаўляюць гістарычныя моманты віцебскай зямлі, падаюць значныя факты з жыцця знакамітых людзей, разважаюць наконт маральных каштоўнасцей у грамадстве.

ДА ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ КОЛЕРААБАЗНАЧЭННЯЎ У СУЧАСНАЙ ЛІНГВІСТЫЦЫ

Ю.М. Бабіч

У культуры кожнага грамадства колер заўсёды адыгрываў важную ролю. Бо здольнасць чалавека адрозніваць колеры, адценні, нюансы афарбоўкі цесна звязана з эстэтычным і філасофскім асэнсаваннем свету. “Колер або спалучэнні колераў могуць успрымацца кожным чалавекам індывідуальна, у залежнасці ад яго досведу, ад культурна-гістарычнага кантэксту і многіх іншых фактараў, г.зн. індывідуальнай карціны свету пэўнага чалавека. Гэта, у сваю чаргу, з’яўляецца перадумовай утварэння індывідуальнай колеравай карціны свету”, – адзначае расійскі лінгвіст І. Брэус. А паняцце “колеравая карціна свету” непасрэдна звязана з праблемай універсальнага ўспрымання колеру.

Сучасная навука надае вялікае значэнне пытанням колеравага ўспрымання. Існуюць шматлікія даследаванні каларыстыкі з пункту гледжання фізікі (Р. Івенс, М. Мінарт, В. Шаронаў), мастацтвазнаўства (С. Аляксееў, Т. Булыгіна, М. Піменава), псіхалогіі (А. Залеўская, А. Мягкова, В. Пятрэнка, А. Жураўлёў). Але ці не найбольшую цікавасць да колеру праяўляе лінгвістыка, паколькі мова з’яўляецца універсальным сродкам захавання і перадачы інфармацыі. А праз каларыстычную лексіку могуць быць выказаны глыбокія і складаныя чалавечыя адносіны да розных сфер жыцця.

Не падлягае сумненню, што колер займае надзвычай важнае месца і ў міжкультурнай камунікацыі. Можна сцвярджаць, што сістэма колераабазначэння ўвогуле вызначаецца моцнай маркіраванасцю ў этнакультуралагічным і этналінгвістычным аспектах. Таму вывучэнне этнамоўных асаблівасцяў каларонімаў з’яўляецца істотным кампанентам даследавання моўнай карціны свету пэўнага этнасу. І тут на першы план выходзяць семантыка колеравай адзінкі і тыя семантычныя і сімвалічныя напластаванні, якія яна атрымлівае ў кожнай асобнай мове. У гэтым сэнсе надзвычай важнае значэнне мела праца амерыканскіх культуролагаў і лінгвістаў Б. Берліна і П. Кея (Berlin B., Kay P. Basic Color Terms: Their Universality and Evolution. – University of California Press. – Berkeley. – 1969), якая па сутнасці паклала пачатак фундаментальным даследаванням у гэтай галіне. Справа ў тым, што раней у тэорыі колеразнаўства дамінавала меркаванне пра розны характар межаў колераабазначэнняў у носьбітаў розных моў. Але пасля апублікавання працы амерыканскіх навукоўцаў увага ўсё больш стала акцэнтавацца не на колеравых межах, а на ядры, своеасаблівым семантычным цэнтры каларонімa, на тым, што потым атрымала назву “фокуснага колеру”. Б. Берлін і П. Кей правялі досыць эфектыўны эксперымент, сутнасць якога заключалася ў наступным. Было адабрана дваццаць чалавек, якія належаць да розных моўных груп, стала жывуць у ЗША і ведаюць як мінімум дзве мовы: сваю родную і англійскую. Ім прапаноўвалася вылучыць асноўныя, базавыя тэрміны для намінацыі колеру ў роднай для іх мове, якія суадносяцца з адзінаццаццю зыходнымі назвамі (basic colour terms – *black, white, red, yellow, green, blue, brown, purple, pink, orange, gray*). Пасля гэтага ўдзельнікі эксперыменту атрымалі 329 узораў, афарбаваных у розныя колеры, з якіх трэба было выбраць тыя, што адпавядаюць кожнай з вылучаных коле-

Репозиторий ВГУ

равых катэгорый, а тут, у сваю чаргу, акрэсліць найбольш характэрныя, найбольш адпаведныя кожнай катэгорыі. У выніку межы колеравых катэгорый у розных мовах аказаліся рознымі. Але вылучаныя ўдзельнікамі эксперыменту самыя характэрныя для базавых колераў узоры, ці, інакш, фокусныя колеры, былі аднолькавыя для аранжавага і чырвонага – у 11 мовах, для шэрага – у 14, для фіялетавага, а таксама карычневага – у 15, для сіняга – у 16, для жоўтага – у 18, для зялёнага – у 19, а для гістарычна асноўнай трыяды – белага, чорнага і чырвонага – у 20 мовах. Менавіта на падставе праведзенага эксперыменту і была потым прапанавана тэорыя колеравых універсалій. Берлін і Кей, даследаваўшы амаль сто моваў, прыйшлі да высновы, што адзінаццаць асноўных колераў сталі своеасаблівым чынам кадавацца ў кожнай мове, а чарговасць з'яўлення тэрмінаў для абазначэння колераў адлюстроўвае характар лінгвістычнага развіцця гэтых моваў. На першым этапе з'явіліся назвы для белага і чорнага колераў. Калі ў мове ёсць тры падобныя колератэрміны, то абавязкова будзе слова для намінацыі чырвонага колеру. У мове з чатырма тэрмінамі ёсць лексема для абазначэння або жоўтага, або спектральна блізкага да яго зялёнага колеру. Пры наяўнасці пяці тэрмінаў мова мае ўласныя назвы і для жоўтага, і для зялёнага. Калі тэрмінаў шэсць, то ў гэтай мове ёсць назва сіняга. Пры сямі тэрмінах павінна быць слова для характарыстыкі карычневага колеру. І, нарэшце, калі ў мове ёсць восем і больш колератэрмінаў, то ў ёй абавязкова будуць асобныя назвы аранжавага, ружовага, фіялетавага і шэрага колераў. Разам з тым неабходна заўважыць, што колькасць базавых колеравых катэгорый у беларускай мове павялічваецца да дванаццаці за кошт тэрміна *сіні*, паколькі для англійскага *blue* існуюць два беларускія адпаведнікі – *сіні* і *блакітны*. Такая, зрэшты, карціна назіраецца і ў блізкароднасных польскай і рускай мовах (*siny* і *błękitny*, *синий* і *голубой* адпаведна). Гэта яшчэ раз даказвае, што носьбіты розных моў суб'ектыўна ўспрымаюць колеравую гаму. Будучы неад'емным элементам кожнай нацыянальнай культуры, колер набывае разнастайную і складаную сістэму сэнсаў і сімвалаў, становіцца ўвасабленнем найбольш значных культурных каштоўнасцяў. Колеравая гама, каларыстыка прыроды па-свойму адметна асэнсоўваюцца ў адпаведнасці з канкрэтнымі ментальнымі ўстаноўкамі.

Апошнім часам актывізаваліся даследаванні колеравай лексікі айчыннымі і замежнымі навукоўцамі ў псіхалінгвістычным аспекце (В. Маслава, А. Васілевіч, Л. Васілевіч, Р. Алімпіева, Р. Фрумкіна, А. Лявонцьеў), у плане выяўлення семантычнай структуры (М. Ампель-Рудольф, Р. Такарскі, А. Брагіна, І. Макіенка) і этнакультурнай спецыфікі (С. Лясовіч, Л. Міронава, А. Шмялёў, А. Вяжбіцка, Р. Гжэгарчыкова, В. Кульпіна). Гэта прывяло да з'яўлення ў сучаснай навуцы паняццяў "лінгваколеравая карціна свету", "лексічная каларыстыка", "колеравая лінгвістыка", або "лінгвістыка колеру". Можна сцвярджаць, што лінгвістыка колеру як самастойны напрамак сёння мае трывалую тэарэтычную і метадалагічную аснову. Таму цалкам пагаджаемся з меркаваннем В. Кульпіной, што "канцэпцыя лінгвістыкі колеру як самастойнай навуковай парадыгмы ў сучасным мовазнаўстве набывае ўсё больш канкрэтныя рысы".

СПЕЦЫФІКА ЭТНАТОПУ Ў ТВОРЧАСЦІ ПРАЗАІКАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

В.Ю. Бароўка

Беларускія навукоўцы шмат увагі надаюць асэнсаванню праблемна-тэматычнай і жанравастылёвай панарам айчыннай прозы ў яе агульнацыянальным і рэгіянальным варыянтах, у той час як многія сэнсава значныя кампазіцыйныя прыёмы незаслужана застаюцца пакуль на даследчыцкай перыферыі. *Мэта* дадзенай працы заключаецца ў вызначэнні семантыка-функцыянальнай ролі этнатопу як важнага змястоўна-сэнсавага і стылёвага элемента ў творчасці празаікаў Віцебшчыны. Для рэалізацыі пастаўленай мэты неабходна 1) даць рабочае азначэнне тэрміна "этнатоп"; 2) устанавіць дэтэрмінанты выбару пісьменнікамі канкрэтнага этнатопу; 3) вылучыць дамінантны тып этнатопу; 4) выявіць асноўныя функцыі этнатопу ў творах празаікаў Віцебшчыны другой паловы XX стагоддзя.

Англійскім даследчыкам Рычардам Рэйдам у другой палове мінулага стагоддзя для паглыбленага вывучэння ідэйна-эстэтычнай этнанацыянальнай спецыфікі літаратурных твораў быў прапанаваны тэрмін "этнатоп", сэнсава і марфалагічна ўтвораны па аналогіі з шырока вядомым "хранатопам" Бахціна. Неабходнасць выкарыстання новага тэрміна Рэйд матываваў тым, што літаратура імпліцытна і эксплiцытна заключае ў сабе інфармацыю пра пэўны этнанацыянальны свет, што прысутнасць чалавека як прадстаўніка пэўнага этнасу не ў поўнай меры ўлічваецца ў той абагульненай прасторава-часавай схеме твора, якую некалі сцісла вызначыў і ахарактарызаваў М.М. Бахцін. Паводле Р. Рэйда, этнатоп – гэта агульная схема твора, якая аб'ядноўвае тры складнікі: час, прастору і этнас. Іншымі словамі, этнатоп ёсць канцэптуальна абраная пісьменнікам

Репозиторий ВГУ